Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ
ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА і ГІДРАМЕТІНСТЫТУТА

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.
Тэл. 24271 і 23280

№ 12 (125)	1—10 кастрычніка	1933 г.

ЗМЕСТ

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА
за 1—10 КАСТРЫЧНІКА 1933 г.

У гэту дэкаду наглядаюцца даволі значныя хістанні характара надвор'я. Калі першыя два дні з'яўляюцца непасрэдным працягам папярэдняй дэкады па свайму добраму надвор'ю і высокай т-ры, якая даходзіла да 13°, то з 3-га дня надвор'е значна пагаршаецца. Сярэдняя сутачная т-ра зніжаецца ў паўночнай палове да 5°—7°, а ў паўднёвай да 7°—9°. У наступныя дні т-ра застаецца нізкай і часамі яшчэ паніжаецца да 4°—5° па ўсёй тэрыторыі БССР. 8-га адбылося некаторае павышэнне т-ры да 8—10°, 9-га гэтае павышэнне працягваецца ў паўднёвай зоне да 12°. У апошні-ж дзень зноў маем значнае паніжэнне т-ры.

Сярэдняя дэкадная т-ра роўна або на 1°—2° ніжэй нармальнай для гэтай дэкады.

Табліца вынікаў метэаралагічных

№№ па карце	Назва станцый	Тэмпературы паветра															
		1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглід. мінімум
3	Полацак[1]	11	13	6	4	8	4	6	8	5	3	—	7	7	17	0	4
52	Дрыса	12	12	6	4	8	5	6	7	5	3	—	7	—	17	—3	10
63	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
65	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
7	Нова-Каралёва[2]	9	12	6	3	7	5	4	7	4	2	—	6	6	16	—2	10
15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
8	Лепель[3]	8	13	6	5	7	5	3	8	6	4	—	6	—	17	0	3
75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
102	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
13	Барысаў	8	13	6	5	7	6	5	8	8	6	—	7	7	18	1	7
16	Менск[4]	9	12	6	5	6	6	5	10	8	6	—	7	7	18	—1	7
93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
23	Мар'іна-Горка	9	12	6	5	7	6	4	9	9	7	—	7	7	17	—1	7
25	Асіпавічы	14	12	7	4	7	6	5	9	9	6	—	8	8	?	4	4
10	Орша[1]	8	12	5	4	6	5	5	7	6	4	—	6	7	16	1	3
19	Горкі[3]	8	11	6	3	5	4	5	7	6	3	—	6	7	16	0	4
88	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
28	Слуцак	10	12	7	5	7	7	5	7	10	8	—	8	—	17	1	7
30	Мар.-Сосны	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
21	Магілеў[5]	8	11	8	4	6	4	5	8	7	5	—	6	7	17	1	7
13	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	Чэрыкаў[6]	10	11	7	4	6	4	4	8	8	5	—	6	8	16	1	7
71	Касцюковічы[7]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
31	Турск[8]	9	11	7	4	6	6	5	8	9	6	—	7	8	17	2	7
32	Жлобін[5]	9	12	8	4	6	6	5	8	9	6	—	6	8	16	2	7
33	Жыткавічы	10	13	8	6	7	9	6	9	12	9	—	9	9	19	1	4
37	Калінкавічы	9	12	8	5	7	6	5	9	12	8	—	8	8	18	2	1
39	Лельчыцы	10	11	9	4	7	10	5	10	13	9	—	8	—	19	2	7
86	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
38	Гомель[8]	10	12	8	5	7	6	5	8	10	7	—	8	8	17	1	7
242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
35	Васілевічы[9]	8	11	10	4	6	6	5	8	11	7	—	7	8	18	2	2
40	Людвінава	11	13	9	5	8	8	5	9	12	8	—	9	9	18	2	8

Увагі: [1] туман (9); [2] туман (8, 9); [3] туман (8); [4] туман (1), моцны вецер (5); [5] туман (1);

назіранняў за 1—10 кастрычніка 1933 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі, ў мм.												Метэаралагічная з'яв (у дужках азначаны чыслы)
	Максім.	Мінімальн.	Чысло, калі нагл. мінімум	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сума	
73	—	—	—	..	3.0	8.0	7.0	3,0	1.0	1.0	0.5	7.0	..	—	30.5	туман (9)
75	—	—	—	..	13.0	10 0	6.0	2.0	0.1	0.3	0.6	1.0	..	—	33.0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	0.4	8.0	5.0	1.0	..	5.0	..	?	..	—	—	—
75	24	—4	10	..	0.3	14.0	7.0	6.0	0.6	4.0	2.0	14.0	..	—	47.9	туман (8, 9)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
73	—	—	—	..	2.0	7.0	7.0	6.0	0.2	3.0	5.0	17.0	0.1	—	47.3	туман (8)
—	—	—	—	..	2.0	6.0	5.0	4.0	..	..	3.0	18 0	0.1	—	38.1	—
—	—	—	—	0.1	1.0	0.1	4 0	5.0	0.5	0.1	3.0	16.0	0.1	—	29.9	—
75	—	—	—	0.1	1 0	7 0	1.0	5.0	1.0	..	1.0	21.0	—	—	37.1	—
71	21	—1	7	0.1	2.0	0.5	3.0	5.0	1.0	0.3	5.0	17.0	0.1	—	34.0	туман (1), моцны вецер
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
76	—	—	—	0.1	2.0	..	0.6	4.0	1.0	..	3.0	14.0	..	—	24.7	—
?	—	—	—	..	..	2.0	2.0	2.0	3.0	..	3.0	13.0	12.0	—	25.0	—
75	—	0	7	..	0.6	4.0	2.0	3.0	1.0	1.0	2.0	20.0	..	—	33.6	туман (9)
80	26	0	10	..	1.0	9.0	2.0	2.0	0.1	0.4	1.0	18.0	..	—	33.5	туман (8)
—	—	—	—	..	..	2.0	3.0	4.0	0.5	..	2.0	14.0	0.1	—	25.6	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
80	—	—	—	..	3.0	1.0	..	3.0	..	..	5.0	9.0	..	—	23.0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
74	—	—	—	..	1.0	5.0	2.0	1.0	..	..	0.5	16.0	..	—	25.5	туман (1)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
79	—	—	—	..	3.0	4.0	0.2	4.0	0.5	..	6.0	19.0	..	—	36.7	туман (10)
—	—	—	—	0.1	8.0	5.0	1.0	4.0	1.0	0.1	..	20.0	..	—	39.2	туман (1), моцны вецер (
70	28	—	—	..	3.0	1.0	0.5	2.0	0.5	..	2.0	19.0	..	—	28.0	туман (1, 2)
64	—	—	—	..	3.0	1.0	0.1	3,0	1.0	..	2.0	11.0	..	—	21.1	туман (1)
65	—	—	—	..	5.0	1.0	..	2.0	1.0	0.1	1.0	0.2	..	—	10.3	—
69	—	—	—	..	4.0	0.1	..	3.0	0.3	..	1.0	0.6	..	—	9.0	—
66	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
72	—	0	7	0.1	9 0	0 5	0.1	3.0	1.0	0.1	1.0	7.0	0.1	—	21.9	туман (1, 2)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
71	—	—	—	..	..	5.0	15.0	5 0	2.0	..	2.0	2.0	..	—	—	—
63	22	2	8	0.2	1.0	..	0.1	?	1.0	0.1	0.1	1.0	0.1	—	—	—

[6] туман (10; [7] туман (1), моцны вецер (3); [8] туман (1, 2); [9] туман (10).

Табл. вынікаў метэаралаг. назіранняў за 1—10 кастрычніка 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ☀ %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальвай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальвай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхнёвага пласта глебы (на глыб. 10—15 см.)
I. Паўночны (Вазёрны)	3	Полацак	W	4	W	6	—	9	7	мокры
	52	Орша	SW	4	SW	9	—	8	7	вільготны
	63	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	65	Сураж.	—	—	—	—	—	—	—	вільготны
	7	Нова-Каралёва . .	NW	6	SW	12	24	8	7	мокры
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—
II. Перахсдны (Вадападзельны)	8	Лепель	SW	6	NW	9	—	9	6	вільготны
	75	Плешчаніцы . . .	—	—	—	—	—	—	—	мокры
	102	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	вільготны
	13	Барысаў	SW	4	NW	12	—	8	7	"
	16	Менск	SW	4	NW	9	—	8	7	"
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка . . .	W	4	SW	12	—	8	7	вільготны
	25	Асіпавічы	W	—	SW	14	—	8	6	"
	10	Орша	W	4	W	4	—	8	6	"
	19	Горкі	SW	4	SE	12	21	8	6.	"
III. Цэнтральны (Раўнінны)	88	Клічаў.	—	—	—	—	—	—	—	—
	119	Ратміравічы. . . .	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	NW	4	NW	9	—	8	6	—
	30	Мар'іна-Сосны. . .	—	—	—	—	—	—	—	—
	21	Магілеў	SW	4	SW	6	—	8	7	вільготны
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў.	SW	4	SW	9	—	8	7	вільготны
	71	Касцюковічы . . .	—	—	—	—	—	—	—	мокры
	31	Турск.	W	4	W	6	31	6	5	"
	32	Жлобін	S	4	NW	9	—	8	6	вільготны
IV. Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	S	4	NW	6	—	8	6	вільготны
	37	Калінкавічы. . . .	W	4	W	12	—	8	6	"
	39	Лельчыцы	SW	6	w	6	—	9	6	—
	86	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба.	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	NW	4	W	6	—	8	7	вільготны
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—
	35	Васілевічы	SW	4	SW	9	27	8	5	вільготны
	40	Людвінава	W	4	W	9	—	9	9	"

Максімальная т-ра за дэкаду хістаецца ад 16° да 19°.

Мінімальная т-ра ў паўночнай і пераходнай зонах апускалася ніжэй 0°. Самыя нізкія т-ры адзначаны ў Дрысе —3° і ў Нова-Каралёве —2°. У астаткіх зонах яны вельмі блізка да 0°, але дадатныя. Такім чынам замаразкі ў гэтай дэкадзе наглядаліся толькі на поўнач ад лініі Горкі—Мар'іна-Горка. Мінімальная т-ра наглядалася пераважна 7-га чысла.

Ападкі выпалі ў наступных колькасцях: на поўнач ад лініі Менск—Касьцюковічы выпала вельмі многа ападкаў, больш 30 мм, асабліва вялікія колькасці адзначаны ў Нова-Каралёве (47,9 мм) і ў Лепелі (47,3 мм). На поўдзень ад памянёнай лініі ападкаў выпала некалькі менш, але ўсё-ж даволі многа, больш 20 мм. Выключэннем з'яўляецца самы поўдзень БССР, Жыткавічы і Калінкавічы даюць малыя колькасці ападкаў—10 і 9 мм. Нажаль адносна ападкаў на поўдні нельга зрабіць сталага заключэння, бо тэлеграмы трох станцый: Васілевічы, Людвінава і Лельчыцы далі відавочна нядобраякасныя дадзеныя адносна ападкаў.

На працягу дэкады ападкі размяркоўваліся наступным чынам: з 2-га да 6-га, а месцамі да 7-га кожны дзень амаль паўсюды наглядаліся дажджы, часам вельмі значныя з колькасцю ападкаў за суткі да 10 мм і нават больш. 6-га, 7-га і 8-га ападкі выпадаюць не паўсюды, а калі выпадалі, то ў малых колькасцях. 9-га амаль па ўсёй БССР адзначаны вельмі вялікія ападкі, месцамі да 20 мм. У апошні дзень ападкаў амаль не было.

Такім чынам у параўнанні з папярэдняй дэкадай і з месячнай нормай ападкаў (40—50 мм) гэта дэкада можа лічыцца вельмі вільготнай.

Вецер мае пераважны напрамак з захаду, але месцамі адхіляецца да поўдня і поўначы, наогул няўстойлівы. Хуткасць ветра сярэдняя 4—6 м/сек., але часам дасягае значных велічынь да 12—14 м/сек.

Воблачнасць вялікая, складае 80—90% агульнага пакрыцця неба. Сонечнае з'янне значна менш, чым у папярэднюю дэкаду і складае ад 20 да 30% магчымага.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідраметэаралагічная характарыстыка за 1—10 кастрычніка 1933 года.

У пераходнай і паўночнай зонах БССР адзначан метстанцыямі замаразак ад 0° да —3° (Горкі, Мар'іна-Горка, Новае Каралёва, Дрыса). Не гледзячы на дрэннае становішча надвор'я, невялікая колькасць ападкаў давала магчымасць палову дэкады (1, 6, 7, 8 і 10) працягваць вытварэнне сельска-гаспадарчых прац—уборку бульбы, успашку на зяб і інш., у астатнюю палову дэкады значная колькасць ападкаў магла перашкодзіць с.-г. вытворчасці.

Азімыя: жыта і пшаніца знаходзяцца ў фазе кушчэння, становішча іх здавальняючае і добрае—пераважна здавальняючае. Метстанцыя Васілевічы (Рэчыцкі раён) адзначае азімыя жыта ў фазе трох лістоў і пшаніца ў фазе ўсходаў.

Метстанцыі не адзначылі пашкоджання бульбы і караньпло даў пад прымаразкаў, якія адбыліся ў гэтую дэкаду.

З сельска-гаспадарчых прац працягваецца ўборка бульбы, успашка на зяб, пачата ўборка капусты і інш. гароднiны. Метстанцыяй Стукачова (Дрысенскі раён) адзначаецца працяг севу азімых.

Становішча папасаў здавальняючае.

Захворванняў заразлівымі хваробамі і падзяжа жывёлы не адзначана.

С. Старобіна.

Папярэднія меркаванні аб тэрмінах замярзання рэк БССР у 1933 годзе

Выходзячы з папярэдняга прагноза надвор'я на перыяд X-XII месяцы бягучага года, які складзен ЦБН СССР, а таксама з маючыхся шматгадовых назіранняў над замярзаннем буйных рэк БССР, у гэтым годзе трэба чакаць наступнае:

1. Невялікі ледаход на рэках БССР пачнецца ў перыяд з 13-га па 16-га лістапада, які ў сувязі з пацяпленнем спыніцца. З 20-га, 23-га лістапада зноў пачнецца ледаход з перарывамі да канца лістапада і пачатку снежня месяца.

2. Мяркуецца, што канчатковы пераход к адмоўным тэмпературам адбудзецца ў трэцяй дэкадзе лістапада, што выкліча **канчатковы ледастаў:**

а) рэк каля 10—15 снежня,

б) вазёр, каналаў і малых рэк каля 5—10 снежня.

3. Такім чынам замярзанне рэк БССР у гэтым годзе наступіць у нармальныя сярэднія тэрміны канчатковага ледастава.

Дырэктар Бюро
Надвор'я БССР *Варушыло.*

Ход конкурса на лепшую метстанцыю

Па дадзеным на 1-IX-33 г. кожная метстанцыя набрала наступны процант балаў:

1.	Асіповічы	46 %	16.	Магілеў	55 %
2.	Бабічы	33 „	17.	Мар'іна-Сосны	35 „
3.	Барысаў	47 „	18.	Мар'іна-Горка	60 „
4.	Бычыха	68 „	19.	Менск	67 „
5.	Васілевічы	49 „	20.	Негарэлае	52 „
6.	Віцебск	76 „	21.	Нова-Каралёва	60 „
7.	Орша	53 „	22.	Полацак	67 „
8.	Гомель	61 „	23.	Сіроціна	45 „
9.	Горкі	72 „	24.	Слуцак	37 „
10.	Дрыса	60 „	25.	Стара-Барысаў	44 „
11.	Жыткавічы	59 „	26.	Турск	67 „
12.	Калінкавічы	78 „	27.	Чэрыкаў	55 „
13.	Крычаў	42 „	28.	Зазер'е	49 „
14.	Лепель	44 „	29.	Асінторф	61 „
15.	Людвінава	54 „		Сярэд. па БССР	55 %

Конкурснай камісіяй заносяцца кандыдатамі на чырвоную дошку наступныя метстанцыі:

1. Калінкавічы, загадчык — т. Булаўко
2. Віцебск, загадчык — т. Фільрозэ

Заносяцца на чорную дошку метстанцыі:

1. Мар'іна-Сосны, Загадчык т. Насановіч Я.
2. Слуцак „ т. Новікава
3. Крычаў „ т. Веселко
4. Лепель „ т. Герман
5. Сіроціна „ т. Поппэ
6. Васілевічы „ т. Чайкоўскі
7. Барысаў „ т. Шотт
8. Зазер'е „ т. Маслякова

Метстанцыя Жлобін (б. заг. т. Шкірман) за ганебны зрыў працы і поўны развал працдысцыпліны з конкурсу выключана.

Новаму загадчыку гэтай метстанцыі т. Депенчуку патрэбна прыняць рашучыя захады к хутчэйшаму падняццю працы станцыі на належную вышыню.

Метстанцыі Бабічы і Стара-Барысаў на чорную дошку не заносяцца, хоць і маюць процант балаў ніжэй 50, таму што балавая ацэнка працы гэтых станцый была выведзена не па ўсіх вымяральніках, за адсутнасцю адпаведных звестак з метстанцый за VIII м-ц.

Старшыня Конкурснай
Камісіі *Кучынскі.*

23/10-33.

ЗАГАД № 108

Па Галоўнаму Кіраўніцтву Адзінай Гідраметслужбы БССР

ад 27/IX-33 г.

Вытвараным абследваннем камісіяй працы і становішча южнай беларускай Навукова-даследчай станцыі Гідраметінстытута ад 13/VIII 1933 г. выяўлена, што склад работнікаў станцыі быў засмечан сацыяльна-чуждым элементам (Купрэенка, Хаданоўскі, Грамыка), якія находзілі абарону з боку загадчыка станцыі Англічанавай. Гэтая група на працягу ўсяго часу да іх звальнення сабатавала і „ціхай сапай“ зрывала выкананне вытворчага плана. У выніку чаго маем шэраг прарываў і шкодніцкіх дзеянняў у выкананні плана:

а) пабудаваныя вадазлівы на буйных каналах не адпавядаюць патрабуемай канструкцыі, работа гэта ў значнай частцы выконвалася тэх. Купрэенкай (кулак).

б) Усваенне і ўпарадкаванне накопленых матар'ялаў назіраннняў не выконваецца і да гэтай працы зусім не прыступілі.

в) Работа па даследванню грунтаў не наладжана.

г) Гідрахэмічная лабараторыя не працуе з-за таго, што не забяспечана дробным лабараторным абсталяваннем і захадаў к набыццю не прынята.

д) Бягучыя палявыя работы выконваюцца нядобраякасна (створы для змярэння расходаў і вызначэння каафіцыента шурпатасці арганізаваны тэхнічна няправільна).

е) План працы па ўпарадкаванню вадазліваў не выканан (з 6 вадазліваў адрамантавана 2), мет. станцыя ў належны стан не прыведзена (не адрамантаван плавучы выпарыцель, не ўстаноўлен выпарыцель Вільда, не працуе глебавы выпарыцель і інш. прылады).

ж) К заканчэнню пабудовы канторы не прыступлена.

з) У працы пануе апартуністычны самацёк, адсутнічаюць комуністычныя метады працы—соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Камісіяй выяўлена безгаспадарчае выдаткаванне сродкаў.

і) Навукова-даследчая праца зусім не вялася, а план палявых работ сорван—не выканан на 40—50%.

Гэта гаворыць аб тым, што з боку дырэкцыі Інстытута і ў першую чаргу т. Лейвікава не было належнага кіраўніцтва і кантроля над работай гэтай станцыі.

Таксама і пасля вынікаў з боку дырэкцыі Інстытута не прынята належных захадаў для забеспячэння выканання плана працы станцыяй і яе аздараўлення.

§ 2.

Дырэкцыі Інст. т. Канавалаву прапаную звольніць з працы загадч. стан. Англічанаву і вырашыць пытанне аб мажлівасці застаўлення яе на станцыі.

§ 3.

Накіраваць на сталую працу з апарата Інстытута ў якасці заг. станцыі здольнага таварыша, які зможа забяспечыць кіраўніцтва выкананнем навукова-даследчага і вытворчага плана.

§ 4.

Перадаць для ўмацавання работнікамі - спецыялістамі апарат і перыферыю Інстытута з Кіраўніцтва т. Барташэвіча.

§ 5.

Прапанаваць дырэкцыі распрацаваць шэраг неабходных мерапрыемстваў, выцякаючых з вынікаў абследвання не пазней 3-х дзённага тэрміну і прадставіць мне на зацверджанне.

Нач. ГК АГМС БССР *Мамаеў.*

ХРОНІКА

26-га кастрычніка бягучага года ў г. Ленінградзе пры Дзяржаўным Гідралагічным Інстытуце адбудзецца Ўсесаюзная нарада па рабоце гідрасеці. На гэту нараду з дакладам аб абслугоўванні народнай гаспадаркі ў галіне гідралогіі і становішчы гідрасеці БССР Галоўнае кіраўніцтва АГМС БССР камандыруе інжэнера В. В. Новыша.

——

17 жніўня ў Галоўным Кіраўніцтве адбылася нарада па пытанню пастаноўкі работы ў Бюро Надвор'я і абслугоўвання ім розных галін народнай гаспадаркі. На нарадзе прысутнічалі: інспектар метслужбы Ваеннага Паветранага флота БВА т. Балабанаў, работнікі Бюро Надвор'я і спецыялісты Гімеіна. Нарада распрацавала шэраг практычных мерапрыемстваў па паляпшэнню працы Бюро Надвор'я.

——

З 6 па 15 верасня ў Ленінградзе адбылася IV гідралагічная канферэнцыя Балтыцкіх краін, на якой паміма СССР прыймалі ўдзел прадстаўнікі Нямеччыны, Даніі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Эстоніі і Фінляндыі, якія па заканчэнні работы канферэнцыі прыслалі ў Цэнтральнае Кіраўніцтва АГМС СССР тэлеграму наступнага зместа: „Пакідаючы пасля двухтыднёвага прыбыцця ў СССР, мы выказваем шчырую падзяку Савецкаму ўраду— высокаму абаронцу канферэнцыі—і палка дзякуем арганізацыйны камітэт і ўстановы, якія добрай арганізацыяй работ канферэнцыі і экскурсій забяспечылі яе поспех, а ў час шматлікіх прыёмаў учынілі нам цёплую гасціннасць.

Сольдан, Мунх-Петерсон, Вельнер, Рэнквіст, Стэкле, Калупайла, Рундо".

Ад Гідраметслужбы БССР у работах канферэнцыі прыймалі ўдзел тт. Лейвікаў, Ліўшыц, Дановіч, Марчанка, Новыш і Булаўка. У адным з бліжэйшых нумароў бюлетэня мяркуецца змясціць артыкул аб работах гэтай канферэнцыі.

Адказны рэдактар **П. Мамаеў.**
Тэхнічны рэдактар **П. Дудкін.**
Члены рэдкалегіі праф. **Кайгарадаў, Бугаеў.**

Друкарня Беларускае Акадэміі Навук. Няміга, 7.

Галоўлітбел № 1487. Заказ № 4597. Тыр. 1000 экз.